Апублікавана ў "Народная Воля" (http://nv-online.info)

# Максім БЕРЫН: «На Захадзе класічная музыка з’яўляецца дарагім мастацтвам і разлічана на эліту грамадства...»

Аўтар: Георгій ЧЫГІР
20.08.2010. 14:19

На пачатку снежня ў Беларусі адбудзецца грандыёзнае свята — першы Міжнародны музычны фестываль “Уладзімір Співакоў запрашае”. Ужо зараз вядзецца актыўная падрыхтоўчая работа. Арганізатары музычнага фэсту (нямецкая кампанія “Берын Арт Менеджмент”) упэўнены, што тыдзень класічнай музыкі пройдзе на самым высокім узроўні і падорыць усім, хто трапіць на канцэрты, незабыўныя імгненні радасці і асалоды.
Спадар Максім Берын (*на фота*) з радасцю пагадзіўся даць эксклюзіўнае інтэрв’ю для чытачоў “Народнай Волі” адносна праекта, які мае намер ажыццявіць. Дзеля гэтай мэты ён нават стварыў у нашай краіне спецыяльную кампанію, якая будзе з’яўляцца эксклюзіўным арганізатарам і ўжо мае адпаведную назву — ТАА “Берын Арт Менеджмент”. Дырэктар яе — Андрэй БЯЛЯЕЎ, малады музыкант, добра вядомы ў музычных колах беларускай сталіцы.



**— Спадар Максім, для пачатку колькі слоў пра сябе, пра сваю кампанію... А таксама пра вашага бацьку, вядомага ў свеце музыканта, галоўнага дырыжора Нямецкага сімфанічнага аркестра і галоўнага дырыжора Маскоўскага сімфанічнага аркестра.**

— І я, і бацька — выхадцы з Беларусі. Але, як споўнілася 17 гадоў, я перабраўся ў Германію, скончыўшы перад тым Беларускі музычны каледж пры кансерваторыі. Паехаў за мяжу, каб прадоўжыць адукацыю. Цяпер за плячыма два універсітэты. Я — прафесійны музыкант, саксафаніст. Яшчэ падчас вучобы ў ФРГ выкладаў спецыяльныя дысцыпліны, быў дацэнтам ва ўніверсітэце і ў Дзяржаўным музычным інстытуце па класе саксафона. Нягледзячы на вялікую колькасць канцэртаў з сімфанічнымі, камернымі і іншымі калектывамі, у 2003 годзе арганізаваў “П’яцолла-Класік-Ансамбль” — квінтэт, які спецыялізуецца на выкананні аргенцінскага танга. Квінтэт і сёння складаюць лепшыя ансамблевыя музыканты Еўропы.

**— І вы па-ранейшаму іграеце ў квінтэце?**

— Так. Нягледзячы на велізарную занятасць як менеджэра, я па-ранейшаму іграю ў гэтым калектыве. Штогадова мы даем звыш за 50 канцэртаў у Старым Свеце. Напрыклад, 22 жніўня сыграем на Каралеўскім фестывалі ў Стакгольме. Увесь час мне карцела нешта ствараць, а не толькі музіцыраваць. І так атрымалася, што 8 год таму была ўтворана мая кампанія, якая так і называецца “Берын Арт Менеджмент”. Зразумела, кампанія нямецкая. На сённяшні дзень яна — лідэр у арганізацыі тураў, канцэртных мерапрыемстваў, усемагчымых шоу-праграм, гала-канцэртаў, камерных, рок-канцэртаў. Праводзім розныя княжацкія балі, дабрачынныя мерапрыемствы, суправаджаем розныя міжнародныя музычныя фестывалі па ўсёй Еўропе. А ў гэтым годзе ўзялі на сябе менеджмент і кіраванне маркетынгавай часткай Royal Festival Stockholm (Швецыя). Наша кампанія на сёння мае 12 прадстаўніцтваў у Еўропе — у Расіі, ва Украіне, у Беларусі, Малдове, Арабскіх Эміратах і іншых.

Што адносна бацькі, то, думаю, ён у вас добра вядомы. Хаця б таму, што больш за 35 гадоў працаваў у Белдзяржкансерваторыі. Загадваў кафедрай канцэртна-сімфанічнага дырыжыравання, быў прафесарам,

стваральнікам дзяржаўнага аркестра. Але вось ужо на працягу 10 гадоў жыве ў Германіі. Працуе з вядучымі еўрапейскімі музычнымі калектывамі, не кажучы ўжо пра тое, што з'яўляецца галоўным дырыжорам Нямецкага сімфанічнага і галоўным дырыжорам Маскоўскага сімфанічнага аркестраў. Дае больш за 100 канцэртаў штогадова. І, зразумела, працуе з лепшымі салістамі планеты, такімі як Хасэ Карэрас, Гіёра Файдман, Даніэль Хоп, Мюлер-Шот, Аляксандр Гіндзін, Мікалай Пятроў, Юрый Башмет, Эл Дзі Меола і шмат з якімі іншымі. Гэтаксама дырыжыруе оперныя спектаклі і робіць балетныя пастаноўкі ў розных краінах Еўропы. Калі хто хоча больш падрабязна ведаць пра творчасць і графік выступленняў Аркадзя Берына, то гэта можна зрабіць, зайшоўшы на яго старонку ў інтэрнэце: www.arkady-beryn.de. Даруйце, што доўга адказваю, але ж у адным пытанні было цэлых два...

**— Наколькі мне вядома, ідэя правядзення міжнароднага фестывалю ў Беларусі сыходзіла ад маэстра Співакова. А як вы спрычыніліся да гэтага праекта?**

— Усё правільна, менавіта Уладзімір Тэадоравіч вынасіў у сабе гэтую ідэю. А я і дырэктар "Віртуозаў Масквы", народны артыст Расіі Рыгор Ільіч Кавалеўскі, з'яўляемся арганізатарамі і, так бы мовіць, паплечнікамі фестывалю. Між іншым, бацька на гэтым фестывалі выступіць у якасці гастралюючага дырыжора ў адной з праграм сумесна з сусветна вядомым кларнецістам Гіёрам Файдманам.

**— Прыезд на Беларусь Уладзіміра Співакова, яго канцэрты — ужо свята для аматараў высокага мастацтва. А тут шэсць фестывальных дзён, акіян музыкі, ды яшчэ ў розных гарадах...**

— Згодны. Выступленні маэстра ў розных краінах свету, уключаючы краіны СНД, — гэта заўсёды яркае свята для аматараў класічнай музыкі, асабліва тых, хто ў захапленні ад яго майстэрства як скрыпача і дырыжора. Фестываль на тое і фестываль, што не можа абмяжоўвацца адным-двума канцэртамі. Ён павінен быць рознапланавым, прадстаўляць самыя розныя напрамкі і музычныя жанры. І потым, Рэспубліка Беларусь зусім не маленькая дзяржава, еўрапейская, тут любяць і разумеюць класічную музыку. Таму мы і палічылі немагчымым абмежавацца толькі Мінскам. У адваротным выпадку гэта выглядала б непаважліва ў адносінах да публікі. Таму канцэрты фестывалю пройдуць акрамя Мінска ў Гомелі, Віцебску, Магілёве...

**— "Уладзімір Співакоў запрашае" — гэта, можна сказаць, візітоўка, крэда маэстра. Ён гатовы дзяліцца сваім мастацтвам з усімі. І да таго ж прыцягвае да сваёй шматграннай творчай дзейнасці мноства талентаў з самых аддаленых куткоў планеты...**

— Гэта сапраўды так. Ужо на працягу многіх гадоў падобны фестываль праходзіць у Маскве, іншых расійскіх гарадах. З велізарным поспехам, перапоўненымі заламі. Уладзімір Тэадоравіч з'яўляецца таксама мастацкім кіраўніком сусветна-вядомага фестывалю ў г.Кольмар, у Францыі. Я лічу, што правядзенне такога фестывалю ў Беларусі стане вялікім падарункам для ўсіх аматараў музыкі, паклоннікаў ягонай творчасці. І потым, Маэстра звязваюць даўнія творчыя сувязі з Беларуссю, з тутэйшай творчай моладдзю, са стыпендыятамі розных фондаў, з навучэнцамі беларускіх музычных устаноў. Між іншым, і цяпер ён будзе мастацкім кіраўніком фестывалю. Хачу дадаць, што час правядзення фестывалю выбраны таксама невыпадкова, бо прыпадае на перадкалядны перыяд. Адпаведна і праграма канцэртаў будзе напоўнена яркімі творамі, жанрава блізкімі да аднаго з самых вялікіх хрысціянскіх святаў.

Што ж адносна пошуку і падтрымкі Уладзімірам Співаковым адоранай моладзі, то гэта адна з галоўных задач ягонай творчасці, жыццядзейнасці. Ён знаходзіць і падахвочвае мецэнатаў, купляе дарагія інструменты, дапамагае юным дараванням паступаць у лепшыя навучальныя установы, стажыравацца ў сусветна вядомых педагогаў і г.д. Усё гэта неад'емная частка ягонага жыцця. Я сам быў сведкам, як пасля арганізаванага маёй кампаніяй тура Уладзіміра Співакова і "Віртуозаў Масквы" па Швейцарыі ён набыў у мясцовых крамах цэлую гару розных рэчаў, пачынаючы з канцылярскіх тавараў, цацак і заканчваючы смычкамі, струнамі, нотнымі сшыткамі. Пытаюся: навошта вам столькі ўсяго? Уладзімір Тэадоравіч жыве збольшага ў Парыжы, мог бы і там усё гэта набыць. А ён адказвае: адсюль еду ў Расію, а там чакаюць дзеці. Гэта ж мой фонд, то хто, калі не я?..

Разумееце, абсалютна чужых дзяцей, але якія маюць талент, ён лічыць сваімі, роднымі. Проста такі чалавек: вярнуцца з паездкі, з гастроляў без падарункаў не можа.

**— Максім, на якіх канцэртных пляцоўках маюць адбыцца канцэрты? Іх у нас няшмат, па-сапраўднаму прыдатных для выканання класічнай музыкі, а тут яшчэ ваш фестываль па часе амаль супадае з міжнародным піяністычным конкурсам...**

— Усе канцэрты ў Мінску пройдуць у зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Канцэрты такога кшталту — гэта эксклюзіў, свайго роду чароўная казка. Перадаць усю гаму жывой музыкі аркестра, кожнага інструмента немагчыма ў агромністай зале, дзе няма атмасферы суладдзя слухачоў і выканаўцаў, дзе няма ідэальнага акустычнага асяроддзя. Ёсць толькі дзве канцэртныя залы ў Мінску — вялікая зала Белдзяржфілармоніі і зала Опернага тэатра.

Вы ж ведаеце, на Захадзе класічная музыка з’яўляецца дарагім мастацтвам, яна разлічана на эліту грамадства, на тых, хто разумее такую музыку. Калі ўвогуле тут прыдатнае слова “разумее”, бо аднаго разумення недастаткова, патрэбны ж адпаведны душэўны стан чалавека, які не рэзаніруе з інтэлектам. Таму канцэрты і будуць праводзіцца не ў агромністых залах, “канюшнях”, а ў адносна невялікіх, з цудоўнай акустыкай, каб у кожнага аматара музыкі была магчымасць наталіцца кожным крэшчэнда, кожным піяна, фортэ і дзімінуэнда... У гэтым сэнс і прызначэнне фестывалю “Уладзімір Співакоў запрашае”.

**— Што маеце сказаць аб праграме фестывальных дзён, канцэртаў непасрэдна?**

— Да пачатку фестывалю яшчэ досыць часу. Таму не буду пра дэталі і нюансы. Скажу толькі, што праграма ўжо існуе. Хто жадае, той можа больш падрабязна пра яе даведацца з інтэрнет-старонкі фестывалю www.spivakov-festival.com, на ёй поўная версія пра фестывалі, там жа і праграма. Скажу толькі, што поруч з класічнымі творамі сапраўды будзе прысутнічаць і джаз. Гэта, на маю думку, надасць фестывалю разнапланавасці, яркасці. Прыедзе на фестываль сусветна вядомы Ал Дзі Меола, гітарыст, жывая легенда. Ды ці толькі ён адзін! Будзе шмат і іншых салістаў, такіх як Дзяніс Мацуеў, Йойа Вендт — вядомейшы нямецкі джазавы піяніст, не гаворачы ўжо пра Гіеру Файдмана, легенду аргенцінскага танга, уладальніка “Оскара” за запіс музыкі да фільма “Спісак Шындлера”. Яму, дарэчы, у гэтым годзе спаўняецца 75 гадоў. Натуральна, адбудзецца канцэрт, прысвечаны юбілею, зразумела, з удзелам самога артыста. І гэты канцэрт пройдзе сумесна з “Віртуозамі Масквы” пад кіраўніцтвам Маэстра Аркадзія Берына.

Апроч таго, у фестывалі возьме ўдзел вялікая колькасць маладых салістаў — стыпендыятаў прэзідэнцкага Фонду Рэспублікі Беларусь, Фонду Уладзіміра Співакова з краін СНД, самыя яркія і таленавітыя музыканты. Канцэрты пройдуць, як я ўжо казаў, і ў залах Магілёўскай, Гомельскай філармоній, у Віцебскім абласным тэатры.

**— Максім, ці мяркуецца праводзіць на Беларусі фестываль “Уладзімір Співакоў запрашае” штогадова, як, напрыклад, у Расіі?**

— Час пакажа. Канечне, мы хацелі б ладзіць такі міжнародны музычны фэст раз на два гады. Як і “Славянскі базар”, наш міжнародны музычны фэст павінен быць запатрабаваны, павінен стаць жаданым для публікі. На фестывальныя канцэрты “Славянскага базару” квіткі разбіраюцца на працягу трох-чатырох тыдняў. Да гэтага будзем імкнуцца і мы. І прыйдзем да гэтага, бо маем досвед, практыку, як арганізоўваць падобныя мерапрыемствы на сапраўды еўрапейскім узроўні.

**— Дзякуй за магчымасць задаць вам пытанні.**

— Дзякуй і вам за ўвагу да мяне і да Першага міжнароднага фестывалю “Уладзімір Співакоў запрашае”... на Беларусь.

---

*Мае меркаванні:*

Тут Вы можаце пакінуць свае меркаванні ці каменты

**nv-online.info** / Source URL: http://nv-online.info/by/101/300/19441/
© Copyright 2009 Народная Воля